ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 5 (322) | Субота, 17 лютага 1979 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту*

## НА ВАРЦЕ СВЯШЧЭННЫХ РУБЯЖОЎ

23-га лютага савецкі народ, працоўныя брацкіх сацыялістычных краін, усе прагрэсіўныя людзі планеты ўрачыста адзначаць 61-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту — надзейнага ахоўніка мірнай працы савецкіх людзей, апоры ўсеагульнага міру.

Стварэнне і развіццё Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту — вялікая гістарычная заслуга У. І. Леніна, Камуністычнай партыі. Абапіраючыся на ваенна-гістарычнае палажэнне К. Маркса і Ф. Энгельса, творча развіваючы яго і прымяняючы да новых гістарычных абставін, У. І. Ленін стварыў каштоўнае вучэнне аб абароне сацыялістычнай Айчыны, якое з'явілася састаўной часткай тэорыі сацыялістычнай рэвалюцыі, будаўніцтва сацыялізму і камунізму.

Як і прадбачыў У. І. Ленін, на долю першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы выпалі цяжкія і суровыя выпрабаванні. Адразу ж пасля перамогі Вялікага Кастрычніка супраць Савецкай рэспублікі аб'яднаным фронтам выступілі ўнутраная контррэвалюцыя і сілы міжнароднага імперыялізму. У гэты цяжкі перыяд ва ўмовах гаспадарчай разрухі, не маючы практычнага вопыту, Камуністычная партыя стварыла масавую рэгулярную армію з цэнтралізаваным кіраўніцтвам, моцнай ваеннай дысцыплінай. 23-га лютага 1918 года ў цяжкіх баях пад Псковам і Нарвай рух войск нямецкіх захопнікаў быў спынены. Гэты дзень стаў штогод адзначацца як Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Рост і ўмацаванне магутнасці Савецкага Саюза, яго выдатны прыклад для міжнароднага пралетарыяту выклікалі нянавісць імперыялістаў. Яны працягвалі выношваць планы знішчэння першай у свеце краіны сацыялізму. У сувязі з узмацненнем ваеннай небяспекі з боку фашысцкіх дзяржаў у Еўропе і на Далёкім Усходзе партыя прымае меры па ўмацаванню арміі і флоту.

22-га чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія здзейсніла разбойніцкі напад на нашу Радзіму. Па сваіх маштабах, удзелу людскіх мас, размерах прымянення тэхнікі і ўзбраення, па свайму накіраванню і жорсткасці гэта вайна не ідзе ні ў якія параўнанні з вядомымі чалавецтву войнамі.

З першых дзён вайны Камуністычная партыя мабілізавала працоўных краіны на барацьбу з ворагам. Сіла ўдараў Чырвонай Арміі па ворагу з кожным днём нарастала. Разгром нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой развеяў міф аб неперам ожнасці нямецкай арміі і прывёў да краху план «маланкавай вайны». У бітвах пад Сталінградам, на Курскай дузе, баях за Каўказ быў дасягнуты карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны. У завяршаючых аперацыях, уключаючы бітву за Берлін, у ходзе якой была разгромлена амаль мільённая варожая групоўка, Савецкія Узброеныя Сілы дабіліся канчатковай перамогі над ворагам, з гонарам выканалі ганаровую місію вызваліцеляў народаў Еўропы ад карычневай чумы фашызму.

Вялікую дапамогу нашым воінам аказвалі працаўнікі тылу. На занятай ворагам тэрыторыі амаль паўсюдна дзейнічалі падпольныя групы і партызанскія атрады. Толькі на тэрыторыі нашай Беларусі актыўна дзейнічала звыш 440 тысяч партызан і падпольшчыкаў.

Наша перамога над ворагам — гэта перамога над ідэалогіяй імперыялізму. Яна карэнным чынам змяніла твар свету, прывяла да ўзнікнення сусветнай сацыялістычнай сістэмы.

Аднак поспехі краін сацыялізму выклікаюць азлабленне і нянавісць у пакуль яшчэ жывучага імперыялізму. Таму, галоўная задача нашай Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, як падкрэсліваецца ў новай Канстытуцыі СССР, з'яўляецца надзейная абарона сацыялістычнай Айчыны. Цесна згуртаваныя вакол Камуністычнай партыі Узброеныя Сілы СССР разам з арміямі краін Варшаўскага дагавору і надалей будуць надзейна абараняць заваёвы сацыялізму.

У нашым універсітэце працуе нямала былых удзельнікаў вайны, падпольнага і партызанскага руху. Яны ўнеслі свой дастойны ўклад у разгром ворагаў. Маладое пакаленне Краіны Саветаў удзячна сваім бацькам і дзядам за нялёгкую і слаўную Перамогу. Яно вучыцца на іх прыкладах, яно звярае па іх свой крок.

**У. СІДАРАЎ,**
**ветэран Вялікай Айчыннай вайны, кавалер ордэнаў Чырвонай Зоркі і Славы III-яй ступені, дацэнт кафедры філасофіі.**

## МАРШРУТАМІ ГЕРОЯЎ

Паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа — адна з найлепшых форм агітацыйна-прапагандысцкай работы, выдатная школа выхавання патрыятызму, камуністычнага светапогляду. 14 лютага узяў старт чарговы Зорны паход студэнтаў нашага універсітэта. Яму папярэднічаў урачысты мітынг, які ўступным словам адкрыў сакратар парткома І. Ф. Эсмантовіч.

Удзельнікаў похода, прысвечанага выбарам у Вярхоўны Савет СССР, і прысутных на мітынгу да глыбіні душы ўсхвалявалаў расказ ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, палкоўніка ў адстаўцы Я. Р. Ермалаева пра баявыя дзеянні лыжнай брыгады, дзе ён знаходзіўся, прайшоўшай на лыжах да зыходнага рубяжа 450 км.

Успамінаецца велічны момант ускладвання вянкоў у студэнцкім парку на брацкай магіле загінуўшым воінам і жывых кветак да помніка У. І. Леніну на цэнтральнай плошчы нашага горада. Такі традыцыйны цэрэманіял — голас сэрца жывых, прысяга на вернасць Радзіме.

60 студэнтаў ГДУ, лепшых прадстаўнікоў усіх факультэтаў, адправіліся ў Зорны паход па маршрутах Рэчыцкага і Лоеўскага раёнаў. Праграма яго самая разнастайная: лекцыі і даклады перад сельскімі жыхарамі, тэматычныя вечары, гутаркі пра новую Канстытуцыю СССР, літаратурна-музычныя кампазіцыі, мітынгі ля брацкіх магіл загінуўшым воінам, практычная дапамога школам у афармленні вучэбных кабінетаў, сустрэчы з героямі вайны і працы, канцэрты мастацкай самадзейнасці, дыспуты і г. д.

Зорны паход разлічаны на 6 дзён. Перад адпраўкай па маршрутах яго ўдзельнікаў цёпла і сардэчна віталі прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар Л. А. Шамяткоў, сакратар камітэта камсамола В. Талсташоў, другі сакратар гаркома камсамола В. Мацюк. Яны пажадалі добрай лыжні, сонечных марозных ранкаў, шчаслівых адкрыццяў і цікавых знаходак, прыемных сустрэч і бадзёрага настрою.

## НАШЫ КАНДЫДАТЫ

### БРОВІКАЎ Уладзімір Ігнатавіч



**другі сакратар ЦК КП Беларусі— кандыдат у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 558**

Бровікаў Уладзімір Ігнатавіч нарадзіўся ў 1931 годзе ў горадзе Ветцы Гомельскай вобласці. Беларус. Член КПСС з 1958 года. Адукацыя вышэйшая. Кандыдат філасофскіх навук.

Пасля заканчэння ў 1955 годзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна У. І. Бровікаў на працягу 8 гадоў знаходзіўся на журналісцкай рабоце ў Віцебскай вобласці. Быў рэдактарам суражскай і аршанскай раённых газет, міжраённай газеты «Дняпроўская праўда» і аб'яднанай аршанскай газеты «Ленінскі прызыў».

З 1963 года У. І. Бровікаў — на партыйнай рабоце. Спачатку — намеснік сакратара парткома Аршанскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення, а з 1965 года — другі сакратар Аршанскага райкома КП Беларусі.

Пасля заканчэння ў 1969 годзе Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС У. І. Бровікаў працуе рэдактарам абласной газеты «Віцебскі рабочы», неўзабаве выбіраецца сакратаром Віцебскага абкома партыі.

У 1972—1978 гадах У. І. Бровікаў знаходзіўся на адказнай рабоце ў апараце Цэнтральнага Камітэта КПСС, з іх больш пяці гадоў быў намеснікам загадчыка Аддзела арганізацыйна-партыйнай работы.

У снежні 1978 года У. І. Бровікаў выбран другім сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі.

У. І. Бровікаў — член Бюро ЦК КПБ. Узнагароджан двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалём.

Уладзімір Ігнатавіч Бровікаў — дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР.

### ШВАРОЎ Уладзімір Лявонавіч



**токар станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава—кандыдат у дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 84**

Швароў Уладзімір Лявонавіч нарадзіўся ў 1930 годзе ў Гомелі. Беларус. Член КПСС з 1958 года. Адукацыя сярэдняя.

Працоўную дзейнасць У. Л. Швароў пачаў пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1949 годзе вучнем токара на станкабудаўнічым заводзе імя С. М. Кірава. У 1953 годзе, пасля службы ў Савецкай Арміі вярнуўся да сваёй прафесіі на той жа завод. З 1957 года працуе токарам-расточнікам.

За час працы на заводзе Уладзімір Лявонавіч вырас у высокакваліфікаванага токара-універсала. Адным з першых ён укараніў у вытворчасць скарасное рэзанне металаў, атрымаў права працаваць з асабістым кляймом. Заданні дзевятай пяцігодкі выканаў за тры гады і адзін месяц, а дзесятай — у жніўні 1978 года. За апошнія восем гадоў на прадпрыемстве ўкаранёна адзінаццаць рацыяналізатарскіх прапаноў.

Свае веды і багаты наватарскі вопыт У. Л. Швароў умела і ахвотна перадае моладзі. Ён навучыў прафесіі токара 11 маладых рабочых.

Выключнай працавітасцю, сціпласцю, высокай патрабавальнасцю да сябе і таварышаў Уладзімір Лявонавіч заваяваў аўтарытэт і павагу калектыву прадпрыемства.

Ён актыўны грамадскі работнік, з'яўляецца членам парткома завода, членам бюро Гомельскага гаркома партыі, дэпутатам абласнога Савета народных дэпутатаў.

За працоўныя дасягненні У. Л. Швароў узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Яму прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР».

Уладзімір Лявонавіч Швароў дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР.

